# Экскурсія ў РАНС
## для грамадзян з абмежаванымі магчымасцямі

14 верасня выхаванцы аддзялення дзённага знаходжання інвалідаў ДУ "ТЦСАН Ашмянскага раёна" адправіліся на экскурсію ў Ашмянскі раённы аддзел па надзвычайных сітуацыях.

Старшы інспектар сектара прапаганды і ўзаемадзеяння з грамадскасцю Маркоўскі Міхаіл Станіслававіч запрасіў у гараж з баявымі машынамі. Паказаў выхаванцам прадметы баявога адзення, пажарна-выратавальнае абсталяванне, распавёў аб наяўных у распараджэнні пажарнай часткі машынах, што з імі звязана, як яны працуюць, чым абсталяваныя.

Радасць і захапленне ў наведвальнікаў АДПІ выклікала магчымасць пасядзець за рулём баявой машыны. Рабяты з вялікай цікавасцю слухалі гісторыі аб тушэнні пажараў, выратаванні людзей і жывёл. Задавалі пытанні.

У заключнай частцы экскурсіі наведвальнікі атрымалі ў падарунак буклеты: «Карысныя парады ад МНС», «Неапалімая Купіна».










МЧС

